Дзяржаўная ўстанова адукацыі
«Грыцкавіцкі навучальна -педагагічны комплекс
дзіцячы сад - сярэдняя школа»

# ДАМЫ НА НАШАЙ ВУЛІЦЫ
(гутарка)

Сяргей Алена Вячаславаўна
сярэдняя спецыяльная адукацыя
1 кваліфікацыйная катэгорыя

аг. Грыцкевічы, 2022

Мэта: пабуджаць у дзецей любоў да сваёй вёскі, вуліцы на якой яны жывуць, да свайго дома;

Праграмныя задачы: фарміраванне патрыятычных пачуццяў; пашыраць уяўленне аб вёсцы, у якой жывуць дзеці, выхоўваць пачуццё адказнасці за сваю вёску, замацоўваць хатні адрас; замацоўваць веданне свайго хатняга адраса, пашыраць веды аб тым, у гонар каго названа тая вуліца, на якой яны жывуць; удасканаленне мовы як гутаркі зносін; дапамога дзецям у пабудове выказвання; ўменні весці дыялог з выхавацелямі і аднагодкамі; працягваць пашыраць уяўленні аб навакольным, імкненне любавацца прыгажосцю архітэктурных збудаванняў; фарміраваць уменне эстэтычна ацэньваць іх.

Матэрыял: прэзентацыя «Маё сяло»

Актывізацыя слоўніка: жылыя, грамадскія, цагляны, панэльны, драўляны, крама, пошта, бальніца, цырульня.

Ход занятку

Дзеці, я сёння ішла на працу і сустрэла хлопчыка, які стаяў і плакаў. Аказваецца, ён згубіўся, яго маці пайшла, а ён не ведае свой хатні адрас.

- А вы ведаеце свой хатні адрас?

- Як называецца вуліца, на якой ты жывеш?

- Чаму яна так называецца?

- Якія будынкі ёсць на вашай вуліцы?

- Якія будынкі мы называем жылыя?

- Якія будынкі мы называем грамадскімі?

- Якія грамадскія будынкі ёсць на вашай вуліцы?

- Як выглядае дом, у якім ты жывеш?

- Колькі ў ім паверхаў?

- З чаго ён зроблены? (цэгла, дрэва, панэлі)

- Значыць ён які? (цагляны, панэльны, драўляны)

- Каля вашага дома ёсць дзіцячая пляцоўка?

- Што на ёй пабудавана?

- А ты ходзіш пагуляць на ёй? З бацькамі ці адзін?

- У які час года ваша вуліца прыгажэйшая? Ці падабаецца яна табе ў любы час?

- Што можаце зрабіць вы, каб ваша вуліца стала чысцейшай і прыгажэйшай?

Дзеці, вы так шмат ведаеце пра сваю вуліцу. Давайце мы зараз з вамі ператворымся ў птушак і ўбачым свой горад з вышыні птушынага палёту. Уключаю прэзентацыю «Мая вёска»

Вынік занятку: Давайце любіць свой дом, свой двор, сваю вёску, бо гэта наша маленькая радзіма. Гэта мы – гаспадары вёскі, ад нас з вамі залежыць, якая яна зараз і якой яна будзе ў будучым.